***Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка***
***Аддзел бібліятэчнага маркетынгу***
***Хроніка***
***культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за жнівень 2024 г.***

***Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу «Объединить, заинтересовать, увлечь»***

*У жніўні ў публічных бібліятэках ДУК працягнуўся раённы конкурс летняга чытання «Объединить, заинтересовать, увлечь». У рамках конкурсу бібліятэкі праводзілі мерапрыемства для дзяцей і падлеткаў.*

***4 жніўня. Кобрын***

*Бібліятэка правяла квэст-гульню «Будзь гатоў салдатам стаць!» для вучняў пачатковых і сярэдніх класаў.*

*Залесская ПБ, 22 чал.*

***8 жніўня. Кобрын***

*У рамках абласной прафілактычнай акцыі «Полезные каникулы» у бібліятэцы праведзена конкурсна-забаўляльная праграма «Классно дружим, весело живем» для выхаванцаў старэйшай групы «Землянички» дзіцячага саду №12.*

*Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 25 чал.*

***16 жніўня. Кобрын***

*У бібліятэцы прайшла краязнаўчая гадзіна «Мая чароўная Беларусь» і конкурс чытальнікаў вершаў пра Беларусь.*

*Батчынская ПБ, 23 чал.*

***16 жніўня. Кобрын***

*Бібліятэкар арганізавала для навучэнцаў 4-5 класаў квэст-гульню «Волшебник из страны детства».*

*Хідрынская ПБ, 19 чал.*

***20 жніўня. Кобрын***

*Бібліятэкар запрасіла юных карыстальнікаў на святочную тэматычную праграму «Ждёт в гости вас Медовый, Яблочный да Ореховый Спас».*

*Тэвельская ПБ, 15 чал.*

***19 жніўня. Кобрын***

*Бібліятэкар сабрала дзяцей на квэст-гульню «Какого цвета лето» для пошукаў зніклых пачастункаў.*

*Гарадзецкая ПБ, 21 чел.*

***24 жніўня. Кобрын***

*Гадзіна прававых ведаў «Правы спажыўца. Гэта трэба ведаць» сабрала у бібліятэцы юных карыстальнікаў.*

*Лукская ПБ, 19 чал.*

## ***Іншыя мерапрыемствы***

***4 жніўня***

*У бібліятэцы адбылося пасяджэнне літаратурнага клуба «ПаэтыКо», які дзейнічае пры Брэсцкім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі. Кіраўнік клуба, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Наталля Кандрашук прэзентавала кнігу «Гэта наша Памяць», у якой надрукаваны вершы шасці членаў клуба і якая пабачыла свет дзякуючы Кобрынскай раённай арганізацыі Беларускага саюза жанчын.*

*ЦРБ, 18 чал.*

***14 жніўня. Кобрын***

*У рамках праекта «Бібліятэка без межаў» для падапечных аддзялення сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў і дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН бібліятэка правяла гісторыка-праваслаўную гадзіну «Август праздник припас – трижды празднует Спас».*

*ЦРБ, 24 чал.*

***16 жніўня. Кобрын***

*Чытачы сталага веку ў рамках праекта «От милосердия в книгах - к неравнодушию в жизни» сустрэліся ў бібліятэцы на краязнаўчым вечары «Яблочный Спас не пройдёт без нас». Надзея Момлик прачытала вершы са сваёй новай складанкі «Слова ад маці».*

*Філіял "Дзівінская ПБ", 18 чал.*

***29 жніўня. Кобрын***

*Падапечныя аддзялення сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў і дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН і псіханеўралагічнага дома-інтэрната прынялі ўдзел у музычна-паэтычнай гадзіне «На любовь свое сердце настрою», прымеркаванай да 100-годдзя з дня нараджэння паэта, барда, празаіка і сцэнарыста Булата Акуджавы.*

*ЦРБ, 34 чал.*

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3 85 81